Источник: "Літаратура і мастацтва" - 2013-06-14

# Чытанні працягваюцца

Імя члена-карэспандэнта Акадэміі навук СССР, літаратуразнаўцы, бібліёграфа, кнігазнаўцы, гісторыка літаратуры Паўла Беркава добра вядомае спецыялістам і аматарам кніжнай справы. У маі 2011 года ў Мінску прайшлі Першыя «Беркаўскія чытанні». Цяпер надышоў час другога форуму.

**Даніла АРЦІМОВІЧ**

Арганізатарамі канферэнцыі (афіцыйная назва — Другая Міжнародная навуковая канферэнцыя «Беркаўскія чытанні. Кніжная культура ў кантэксце міжнародных кантактаў») выступілі Цэнтральная навуковая бібліятэка імя Я. Коласа НАН Беларусі, а таксама Навуковы і выдавецкі цэнтр «Навука» Расійскай акадэміі навук. Яе ўдзельнікі — навукоўцы з Беларусі, Расіі, Украіны, Польшчы, Літвы і Балгарыі.

Падчас адкрыцця былі зачытаныя прывітанні ад намесніка старшыні Прэзідыума НАН Беларусі акадэміка Уладзіміра Гусакова і прэзідэнта Расійскай акадэміі навук акадэміка Юрыя Осіпава. Акадэмік-сакратар аддзялення гуманітарных навук і мастацтваў НАН Аляксандр Каваленя выказаў удзячнасць гаспадарам форуму — ЦНБ імя Я. Коласа, якая выступае пляцоўкай для папулярызацыі новых навуковых адкрыццяў і распрацовак, што ажыццяўляюцца супрацоўнікамі НАН. Падобныя чытанні сведчаць пра высокі навуковы патэнцыял установы.

На пленарным пасяджэнні найбольш цікавымі падаліся два даклады. Назва выступлення дырэктара ЦНБ Наталлі Бярозкінай афіцыйна гучала як «Кніжныя гісторыі: старонкі з жыцця кніг». Але на практыцы Наталля Юр'еўна сканцэнтравалася на гісторыі радзівілаўскай бібліятэкі, спынілася на асобах Мікалая Радзівіла Чорнага, Мікалая Радзівіла Сіроткі, Ганны Радзівіл, Мікалая Радзівіла Рыбанькі і Караля Станіслава Радзівіла Пане Каханку. Яна нагадала, што ў 1772 годзе, пасля першага падзелу Рэчы Паспалітай, калі Нясвіж занялі рускія войскі, радзівілаўскую бібліятэку (15 тысяч асобнікаў) вывезлі ў Санкт-Пецярбург. Пане Каханку пратэставаў, але мусіў задаволіцца грашовай кампенсацыяй.

У 1880-я гады, пры Антонію Радзівілу, адбылося аднаўленне кніжніцы. Пасля далучэння Заходняй Беларусі 10-тысячная бібліятэка была перададзена ў Акадэмію навук. Але пасля вайны з радзівілаўскай спадчыны вярнуліся толькі кнігі, якія паспелі прайсці першасную апрацоўку ва ўстанове. Астатнія асобнікі знаходзяцца ў іншых месцах. Пра значэнне бібліятэкі сведчыць той факт, што ў 2009 годзе кнігазбор Радзівілаў быў уключаны ў рэестр ЮНЕСКА. Таму задача бібліятэкараў — стварыць агульны рэсурс, які б адлюстроўваў усе звесткі пра яе.

Сяргей Лютаеў, загадчык лабараторыі кнігазнаўства Дзяржаўнай публічнай навукова-тэхнічнай бібліятэкі Сібірскага аддзялення РАН, разважаў над праблемай «Кніжнасць як традыцыя». Ён адзначыў, што на эвалюцыю кнігі ўплываюць крызісныя тэндэнцыі. У Расіі адкрыта кажуць пра катастрафічнае зніжэнне цікавасці да чытання. Між тым, кніга звязвае пакаленні людзей. Трываласць гэтых сувязей правяраецца часам, прычым адно з такіх выпрабаванняў адбываецца цяпер. Дакладчык параўнаў цяперашні пераход ад друкаванай да электроннай кнігі з пераходам ад рукапіснай да друкаванай.

На думку С. Лютаева, існуюць як мінімум тры пытанні, адказы на якія мусіць шукаць навуковая аўдыторыя. Цяпер адбываецца змена пакаленняў, што звязана з пераасэнсаваннем каштоўнасцей і стварэннем іх новай сістэмы. Якое месца зойме ў ёй кніга? Пакуль сацыёлагі сведчаць, што яе каштоўнасць ацэньваецца хутчэй са знакам мінус. Другое пытанне звязана з успрыманнем кніжнасці як старажытнай традыцыі. Таму кнігазнаўцы больш даследуюць сучасную кнігу, а філолагі — рэдкую. Атрымліваецца пэўная раз'яднанасць. Трэцяе пытанне — суіснаванне кніжнай і экраннай культуры, або друкаванай і электроннай кніг.